**ДРУГІ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**2021/2022 навучальны год**

**Комплексная работа**
**9 клас**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Адзначце правільныя сцверджанні:**

*Колькасць балаў – 6*

1. Граматычная аснова сказа можа складацца з аднаго члена сказа – дзейніка або выказніка.
2. Калі дзейнік і выказнік выражаны назоўнікамі ў назоўным склоне, паміж імі заўсёды ставіцца працяжнік.
3. У слове 'дождж' чатыры гукі.
4. Дзеепрыслоўе – асобая нязменная форма дзеяслова.
5. Акцэнталагічныя нормы рэгулююць месца размяшчэння націску ў словах.
6. Асноўныя адзінкі сінтаксісу – слова, словазлучэнне, сказ і тэкст.
7. Пры змяненні слова (напрыклад, скланенні назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў) утвараюцца формы аднаго і таго слова.
8. Словы ў словазлучэннях звязаны двума відамі падпарадкавальнай сувязі: дапасаваннем і прымыканнем.
9. Паводле паходжання прыназоўнікі падзяляюцца на вытворныя і невытворныя.
10. Паводле мэты выказвання сказы бываюць апавядальныя, пытальныя і клічныя.

**Заданне 2. Размяркуйце словы па слупках табліцы ў адпаведнасці з колькасцю гукаў.**

*Колькасць балаў – 6*

***Увага! Ёсць”лішнія”словы.***

Ячня, жніўё, чагосьці, бейсбол, вазьмі, зжаць, будзьце, расчасаць, абысці, ездзіць, мядзведзь, слухаць, з’ездзіць, маёр.

| 5 гукаў | 6 гукаў | 7 гукаў |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 3. Устаўце прапушчаныя літары о, э, а.**

*Колькасць балаў – 6*

| | | |
|---|---|---|
| Ч..рнавокі | р..дказубы | ф..такамера |
| д..брадзей | в..семсот | ск..араход |
| ш..равокі | ч..рнавалосы | к..негадоўля |
| ст..грамовы | д..браякасны | в..сьмісоты |

**Заданне 4. Утварыце дзеясловы незакончанага трывання пры дапамозе суфіксаў -ва-, -ыва-, -іва-.**

***Узор: вымыць – вымываць***

*Колькасць балаў – 6*

| | | | |
|---|---|---|---|
| Падкрэсліць | | выпісаць | |
| праветрыць | | адгадаць | |
| расклеіць | | адрозніць | |

**Заданне 5. Запішыце ўласныя імёны і геаграфічныя назвы па-беларуску.**

*Колькасць балаў – 6*

| | | | |
|---|---|---|---|
| Авдотья | | Брюссель | |
| Алла | | Голландия | |
| Виолетта | | Забайкалье | |
| Анна | | Калькутта | |
| Жанна | | Уручье | |
| Татьяна | | Уречье | |

**Заданне 6. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі з кампанентам 'муха' і іх значэннямі.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| А. З мухамі ў носе | 1. Снег, сняжынкі |
| Б. Як сабаку муха | 2. Хто небудзь, нечакана раззлаваўшыся, занадта гарачыцца |
| В. Белыя мухі | 3. Вельмі ўпарты, капрызны, наравісты |
| Г. Мухі дохнуць | 4. Нясцерпна сумна |
| Д. Шалёная муха ўкусіла | 5. Вельмі ціхі, лагодны, пакорлівы |
| Е. Мухі не пакрыўдзіць | 6. Нічога не значыць для каго-небудзь, далёка не дастаткова каму-небудзь |

Адказ: А_ Б_ В_ Г_ Д_ Е_

**Заданне 7. Пастаўце ў сказах прапушчаныя знакі прыпынку, вызначце, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы.**

*Колькасць балаў – 6*

| Сказ | Часціна мовы |
|---|---|
| Серафім Іванавіч зразумеў **што** чалавеку гэтаму не церпіцца расхінуць перапоўнененую крыўдаю душу. | |
| **Вакол** дома надзейна ўкрытага густым ельнікам буяў яркімі вяргінямі кветнік. | |
| Там за далёкім борам **і** неба выглядала больш блакітным. | |
| Начное чэрвеньскае неба густа крэслілі метэарыты **што** асабліва густа падаюць у гэты час. | |
| **Пераапрануўшыся** Васіль накіраваўся на заняткі. | |
| **Чацвёрка** атрыманая за кантрольную па матэматыцы не давала Міхасю спакою. | |

**Заданне 8. Размяркуйце словы ў адпаведнасці з іх лексічным значэннем.**

*Колькасць балаў – 6*

Андарак, бэлька, намітка, кадушка, світка, цэбар, збан, кажух, дах, прызба, ступа, свіран.

| Назвы частак дома, сялібы | Назвы посуду | Назвы адзення |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 9. Прачытайце. Вызначце назву і аўтара твора.**

*Колькасць балаў – 6*

1. Над пустым бульбянішчам Тэклінага агарода, над недалёкім выганам і дарогай, што, узбегшы на ўзгорак, хаваецца ў шэрай далечы, марудна паўзе восеньскі адвячорак. Некуды спяшаюцца імклівыя пакудлачаныя хмары ў небе, за хатамі ў вёсцы трывожна бляе авечка, і недзе разважна гергечуць гусі.

Тэкля сячэ, адпачывае ў кароткіх перапынках і ўвесь час азірае дарогу.

**Аўтар___________________, назва твора___________________**

2. Рака шалела. Нізавыя парывы вятрыскі раскалыхалі вялікія, у рост чалавека, хвалі. Яны каціліся супраць плыні, шоргаючы белымі грабянцамі. Хвалі ішлі адна за адной, і процілеглы бераг губляўся ў чарнільнай навальнічнай цемры.

Але і адтуль, са змроку, далятаў усхваляваны, нізкі гук вады.

**Аўтар____________________, назва твора____________________**

3. За вокнамі – позняя мокрая восень.

Чацвёрты і пяты класы злучаны ў адзін пакой – на “беларускую гадзіну”. Вучні-палякі пайшлі на гэты час дахаты, аднак і без іх у вялікім пакоі двум класам вельмі цесна.

**Аўтар____________________, назва твора____________________**

**Заданне 10. Прачытайце. Вызначце, пра якіх беларускіх пісьменнікаў ідзе гаворка?**

*Колькасць балаў – 6*

1. Гэты пісьменнік з’яўляеца аўтарам кнігі “Казкі жыцця”. ________________
2. Першы зборнік гэтага пісьменніка “Жалейка” выйшаў з друку ў 1908 годзе.________________________________________________________________________
3. Яго сапраўднае прозвішча Самуіл Плаўнік. “Шчасце не ў золаце”, – гаварыў вядомы беларускі пісьменнік. ____________________________________
4. Гэты пісьменнік у XVI стагоддзі ў горадзе Рыме стварыў на лацінскай мове сваю неўміручую паэму. ________________________________________________
5. З-пад пяра гэтага пісьменніка выйшаў адзіны прыжыццёвы зборнік “Вянок”. ______________________________________________________________
6. Яго прозвішча супадае з назвай шырокага капелюша з палямі. ____________